Download



"Вясна" назірае

⚡**«Міліцыянты папрасілі аднесці сцяг да службовай машыны». На 2900 рублёў аштрафавалі дзяўчыну за пікетаванне ў лесе каля санаторыя «Радон»**

19 чэрвеня каля санаторыя «Радон» у Дзятлаўскім раёне затрымалі **Віктара Мацкевіча**. Ён з кампаніяй знаёмых адпачываў на беразе ракі Моўчадзь у выходны дзень, а сваю палатку паставіў ў лесе. На гэтай палатке Віктар размясціў **БЧБ-сцяг**, які і стаў прычынай затрымання. Затрыманне ажыццяўляў **падпалкоўнік з Дзятлаўскага РАУСа У. І. Святоха**. У РАУСе на мужчыну склалі пратакол **па арт. 24.23 КаАП**, расцаніўшы яго адпачынак як «несанкцыянаванае пікетаванне». 22 чэрвеня на суд да Віктара прыйшла падтрымаць яго знаёмая **Ірына Трафімік**, але яе затрымалі наўпрост падчас суда. Дзяўчыну абвінавацілі ў **«несанкцыянаваным пікетавані 19 чэрвеня шляхам дэманстрацыі БЧБ-сцяга і выкрыкванні лозунга "Жыве Беларусь" у лясным масіве»**. У РАУСе на Ірыну склалі пратакол па **арт. 24.23 КаАП** і адпусцілі дадому.

Доказам віны, меркавана, стала відэа, з якім Ірыне не далі нават азнаёміцца. **Суддзя Наталля Лобан і старшыня суда Дзятлаўскага раёна Сяргей Сёмуха** палічылі, што «**адмова ў азнаямленні з відэа на дыску не парушаюць правы Ірыны на абарону»**. На думку Ірыны, супрацоўнікі абрэзалі пачатак відэа, на якім просяць яе аднесці сцяг у іх службовую машыну, а пакінулі толькі тую частку, дзе яна нібыта «шпацыруе са сцягам па лесе».

⚖️9 ліпеня **суддзя Наталля Лобан** прызнала Ірыну Трафімік вінаватай у «пікетаванні ў лясным масіве» і аштрафавала яе **на 2900 рублёў (100 базавых велічыняў).**
t.me/viasnanazirae/391
5.9K viewsJul 9, 2021 at 14:38

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy